Цана асобнага № 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ЗАРА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 5 — Вільня, Пятніца 15-га чэрвеня 1928 г. — Год 1

Спадароушчына на зьмерку.

Не расцвел и отцвел
В блеске летняго дня...

Ня так ужо даўно на беларускай палітычнай авансцэне зьявіўся з „высокіх студыяў у Празе Чэскай" доктар філёзофіі Янка Станкевіч, ці, як папулярна яго называе, з яго ўласных слоў, беларуская прэса—„наўчоны спадар". З лёгкай рукі гэтае папулярнае слова хутка распаўсюдзілася паміж шырокіх беларускіх працоўных гушчаў, і цяпер на ўсім абшары Зах. Беларусі ведаюць названую асобу пад гэтым імем, пераменяючы часам яго на вытваранае самім народам — „Паўлючок".

Асоба вельмі арыгінальная па сваей натуры, маючая за сабою пэўную прошласьць у беларускім руху—Янка Станкевіч па прыезьдзе сваім у Вільню хутка зьвярнуў на сябе агульную ўвагу сваімі „дзівосамі і сьмяхотамі", праяўленымі на полі „рэформы" ім — беларускае мовы, спачатку на старонках „Сялянскае Нівы", фактычным рэдактарам якое ён зразу-ж па прыезьдзе стаўся, а потым і ўсюды, дзе толькі мог прылажыць руку, стаўшыся праз гэта об'ектам самага непадробленага гумару для „Маланкі", як таксама і для ўсей беларускай інтэлігенцыі.

Палітычна Янка Станкевіч нявыраблены. Валадае найбольш яскрава выяўленым інстынктам, згодна якому ўсе яго лічылі беларускім шовіністам, стаячым на самым правым крыле ўсяго руху наагул. Па прыезьдзе з Прагі прыстаў да „Сель-Саюзу", з цячэньнем, аднак, вельмі кароткага часу адыйшоў ад яго, творачы ўжо разам з выразнымі грамадзкімі авантурнікамі „Сялянскую Партыю" з вельмі такі нявыразным палітычным аблічам. Радыкальная прэса, вітаючы адыход Янкі Станкевіча ад „Сельсаюзу", думала бачыць у гэтым адыходзе фактар, спрыяючы шырокай народнай справе, аднак ацэньвала гэты факт з вялікімі засьцярогамі.

Гэтыя засьцярогі не аказаліся лішнімі. Пры наступіўшых выбарах Янка Станкевіч пашоў ужо выразна проці работніцка-сялянскага руху, стаўшы на адну плашчыну з Умястоўскім ды Паўлюкевічам. Дзякуючы проста такі спэцыяльнай выбарнай кон'юнктуры — па Лідзкай выбарнай акрузе, дзе былі пакасованы ня толькі сялянска-работніцкія, але навет усе беларускія сьпіскі—Я. С. разам з ідучым за ім Ф. Валынцам прайшлі ў Сойм. Пачаўся новы пэрыяд сьвежасфабрыкаванае палітычнае арганізацыі, новая праца, якая і носіць назоў—*спадароўшчына*.

На беларускім сьметніку, які мае назоў „Народ", паўстаў запраўдны пятушыны бой проці „ўсіх і ўся", не разьбіраючы ні правых, ні левых. Поруч пачаўся шум з твараньнем нейкіх штучных „польска-беларускіх т-ваў", „гаспадарчых зьвязаў", жаночых ды яшчэ якіхсьці гурткоў. Сталі хадзіць чуткі аб ліквідацыі Вярнікоўшчыны, Умястоўшчыны, аб зьліцьці ўсіх гэтых „палёнафільскіх" арганізацыяў у спадароўскім рэчышчы. Але так растучая спадароўшчына ўжо ў самым сваім зародку мела гніль— брак стычнасьці з працоўнымі масамі, якія складаюць галоўны фундамант жыцьця і росцьвіту ўсялякай арганізацыі. „Спадароўшчына" чаплялася за вярхі, а пад нагамі апынулася прорва.

Аж раптам заламалася. Пас. Валынец адыходзіць ад свайго саюзьніка, прадстаўнікі нэйтральнага грамадзянства ня хочуць мець з Янкам нічога супольнага, пашлі ўпорлівыя чуткі аб расчараваньні ў самым блізкім, вельмі нялічным, акружэньні доктара, у народзе Янка слыве за „Паўлючка" з усімі выцякаючымі адгэтуль насьледкамі. Адным словам—*пачаўся зьмерк спадароўшчыны*.

Янка Станкевіч у сваей генэральскай амбіцыі „дзеяча" аказаўся прыладай у руках пэўных колаў віленскай санацыі, якая думала бачыць у ім прадстаўніка нейкага адламу беларускага грамадзянства, які, процістаўляючы розным „выўротувцам", хацела зрабіць ручным і праз яго... рабіць „беларускую справу". Цяпер і яна, як відно, астаецца ля разьбітага карыта.

Жыцьцё мацнейшае за генэральскія і за маральныя камбінацыі. Есьць беларускія працоўныя гушчы, якія жыцьцёвыя абставіны прывялі да масавых арганізацыяў і да масавай сьвядомасьці. З гэтаю сьвядомасьцю трэба лічыцца ўсім. Памёр Паўлюкевіч, паміраe Умястоўшчына, на чарзе і спадароўшчына. А народ усё перажывае.

Крызіс фашызму у Італіі.

Газэты нядаўна падалі сэнсацыйную вестку аб тым, быццам Мусоліні сам — на выпадак сваей сьмерці — рые ўжо магілу заадно ўжо — і спароджанаму ім фашызму, рыхтуючы пераход да адбудаванай дэмакратыі!... Весткі, якія ідуць з Італіі,—аб гаспадарчым заняпадзе краю, які фашыстаўская сыстэма ўжо яўна для саміх усемагутных там капіталістаў вядзе да катастрофы, дасканала тлумачыць гэтыя паніхідныя перакананьні Мусоліні...

Цікаўныя факты і лічбы ў гэтай справе падае італьянскі сацыяліст-эмігрант Модыльяні (прыведзены ў № 156 „Robotnika" — арт. п. Чапіньскага).

Гадовая справаздача дырэктара Італьянскага Дзяржаўнага Банку сьцьвярджае вельмі дрэннае агульнае фінансава-гаспадарчае палажэньне краю.

Справаздача сьцьвярджае—агульны гаспадарчы застой у краі; зьменшаньне агульнага спажыцьця ў краі; недахоп грошаў і крэдыту ў краі; далейшае зьменшаньне рынку для краёвага і загранічнага гандлю—пры цэнах у краі вышэйшых, чым загранічныя. Усе гэтыя зьявішчы беспасярэдна выклікаеы мерамі ўраду — па падняцьцю валюты і аднячаснаму зьменшаньню лічбы курсуючых у краі інфляцыйных, мала цэнных ліраў, ці прасьцей — аздараўленьнем ад „вадзянкі" грашовага абегу ў краі.

Дык — як толькі італьянскі ўрад стаў аздараўляць сваю валюту, дык зараз-жа і скончыліся ўсе так гучна рэклямаваныя пасьпехі фашыстаўскай гаспадаркі...

Палажэньне пагаршаецца яшчэ і тым, што, як гэта было ня так даўно і ў Польшчы, — падняцьце вартасьці валюты не выклікае суадказнага спадку цэнаў у краі на тавары, у выніку чаго ствараецца страшэнная дарагоўля ў краі, выклікаючая бунты навет сярод фашыстаўскіх, работніцкіх і іншых арганізацыяў, пагражаючы так рэклямаванаму фашызмам „сацыяльнаму міру" ў краі.

Вынікам усяго гэтага зьяўляецца — паніжэньне наагул загранічнага гандлю Італіі— як увозу, таксама і вывазу, асабліва—апошняга. За мінулы год гандлёвы дэфіцыт (недахоп грошаў у краі — з прычыны перавагі ўвозу над вывазам) узрос з 4,4 мільярдаў да 4,8 мільярдаў. А фактычна гэты дэфіцыт — яшчэ большы, бо вартасьць італьянскай валюты паднялася.

Гаспадарчы заняпад Італіі — пад фашыстаўскім урадам — выказаўся ня толькі ў прамысловасьці ды гандлю, але і ў земляробстве: справаздача дырэктара Банку сьцьвярджае зьменшаньне засеўнай плошчы ў краі і тасаваньня штучных гнаёў.

Ня менш цікаўныя лічбы падае афіцыяльна мін. скарбу. Міністар сьцьвярджае значны спадак увозу—вывазу—штосьці—на 300 мільёнаў за 3 першыя месяцы гэтага году,— у параўнаньні з папярэднім. Усё гэта, зразумела, адбіваецца ад'емна на спагоне падаткаў з гандлёвых абаротаў, што асабліва непакоіць мін. скарбу. Але фашыстаўскі ўрад потым зусім ня мае намеру зьмяняць сваей палітыкі вялікадзяржаўнага імпэрыялізму, а дзеля таго — зусім ня думае зьмяншаць выдаткаў на гэтыя свае каштоўныя „амбіцыі". Дык урад не зьмяншае бюджэту, а наадварот — павялічвае яго.

У дадатку да ўсяго гэтага палітыка Мусоліні папсавала стасункі палітычныя, а потым і гандлёвыя, з краямі, якія гаспадарча зьяўляюцца найбольш патрэбнымі ды карыснымі для Італіі, — як Францыя, Югаславія і Аўстрыя. А ўрад усьцяж накладае ды спаганяе падаткі, не зьмяншаючы іх цяжару, як усьцяж абяцае, але, наадварот — павялічваючы яго...

Вось тутака зьяўляецца найвялікшая небясьпека для фашызму, калі — не для самой Італіі.

—·—

Як ведама, сацыяльны зьмест фашызму і „смак" так рэклямаваных ім—„сацыяльнай раўнавагі" ды „сацыяльнага міру" — у тым, што прамысловец, абшарнік, банкір, ці гандляр, заўсёды — пры дапамозе ўсяго пакорнага ім дзяржаўнага апарату — могуць — бо маюць сілу — перакладаць усе цяжары працы ды падаткаў на каркі працоўных. Дык пакуль гэтыя капіталісты мелі — дзякуючы таннай валюце ды таннай працы ў краі — вялікія зыскі з загранічнага гандлю, дык усё йшло добра, мірна, гладка, згодна. Капіталісты, ня дзелючыся з працоўнымі сваімі вялізарнымі зыскамі, маглі ня вельмі, праўду кажучы, і крыўдзіць іх: таннасьці працы суадказвала адносная таннасьць тавараў, — наагул жыцьця, такім чынам і магчыма было для фашызму раздушыць вольны работніцкі рух, разьбіць арганізацыю работніцкіх партыяў, стварыць свае „сындыкаты", дзе ўжываліся неяк разам у аднэй арганізацыі і працадаўцы і працаўнікі, — стварыць ілюзыю поўнага скасаваньня клясавай барацьбы, чым так хваліцца Мусоліні...

Але цяпер, калі гэтыя штучныя фінансавыя варункі ў краі спыніліся, „клясавая вайна" ў краі паўстае ізноў у-ва ўсей яе сіле... Цяпер капіталіст, на якога фашыстаўскі імпэрыялізм усьцяж накладае непадсільныя для яго падаткавыя цяжары, павінен усё больш і больш, як кажуць, дакладаць галавой работніка...

Хаця-ж фашыстаўскі ўрад, імпэрыялістычны на вонках ды паліцэйска-мілітарыстычны ўнутры краю, заўсёды трымае руку капіталістаў, але, нажаль, — гэтаму перакладаньню цяжараў з карку капіталіста на карк работніка ёсьць ведамы рубеж.

І вось гэты рубеж на нашых вачох пачынае пераходзіцца ў фашыстаўскай Італіі. Пасол Модыльяні сьцьвярджае, што — работніцкія платы гвалтоўна спадаюць цяпер у краі. Асабліва, як заўсёды, безбаронна эксплёатуецца вёска: на вёсцы платы спалі напалову — раўнуючы да — фашыстаўскіх часоў... Таксама амаль не на 50% спадаюць платы і ў мястовых прамысловых цэнтрах.

Дык навет фашыстаўскія работніцкія арганізацыі пачалі бунтавацца... Пачаліся мітынгі, зьезды работніцкіх арганізацыяў, якія выносяць вострыя рэзалюцыі пратэсту. Спадак платаў асабліва раздражняе — бо побач з ім ідзе ўзрост дарагоўлі, гандлёвыя пасрэднікі — драбнейшая буржуазія — гледзячы на буйнейшую: фабрыкантаў ды аптавікоў,— ня хоча адставаць ад іх, дый таксама перакладае цалкам, а можа дык і з дадаткам, — цяжары дарагоўлі на карк спажыўца — працаўніка... Работнік усё больш і больш пачынае адчуваць суровую, жорсткую праўду свайго сацыяльнага палажэньня, закрытую ад яго часовай штучна—створанай „добрай каньюктурай" ды траскуча—імпэрыялістычнай фразолёгіяй фашызму... Усё больш пачынае разумець работнік сумную патрэбу сацыяльнай барацьбы — сумную праўду сацыялізму... Чаму? — А вось — хаця б таму, што — толькі што італьянскі работнік меў некалькі раз на тыдзень мяса, цяпер ня мае... Побач з тым — расьце ў краі беэрабоцьце, расьце і армія безработных, гэты „авангард" у барацьбе.

Пануючыя ў Італіі клясы бачаць 2 выхады з палажэньня: або паварот да нармальнага стану, да дэмакратыі ды больш-менш вольнай сацыяльнай раўнавагі ў краі, а — у першую чаргу — спыненьне тэй запраўднай пашчыны для працоўных, якой зьяўляецца ды робіцца ўсё больш фашыстаўская „сацыяльная раўнавага", выклікаючая пагрозу вострага выбуху сацыяльных супярэчнасьцяў, ці новую рэвалюцыю злева; або — якуюсь новую імпэрыялістычную авантуру, якая-б кінула масу „звольненых ад працы", ня маючых месца ў краі, „лішніх", беспакойных і небясьпечных людзей (з прычыны гаспадарчага крызісу) — на ваенную бойню...

Што выбярэ ў апошні мамэнт Мусоліні, цяжка сказаць. Справу можа вырашыць, як гэта бывае ў такіх выпадках, — прыпадак, тая, ці іншая „іскра", кінутая ходам падзей у той „склад пораху", якім зьяўляецца фашыстаўская Італія, захопленая вострым крызісам... Як бачым, Мусоліні ўжо кажа аб „пераходзе да дэмакратыі". Сам быццам капае ўжо магілу сабе і свайму фашызму, пяе яму паніхіду...

Але гэта не павінна нікому „замыліваць вочы"... Бо-ж у кожны мамэнт той-жа Мусоліні можа раптам зрабіць—„дэвэрсыю", затрубіўшы паход—ці на Югаславію, ці на францускі Туніс, ці навет—на самую Францыю...

Бо-ж ніколі, пакаштаваўшы ўлады, так лёгка з ёй не разлучаюцца...

З Сойму.

(14 паседжаньне).

Дыскусія над бюджэтам Міністэрства Земляробства і Зямельных Рэформаў.

На пачатку 14 паседжаньня Сойму (2 ч.) пас. Зьвежыньскі (Н. Д.) ад імя рэгуляміновай камісіі здаваў справу з унёску пас. Вацлава Бінікэра, з Хрысьц. Дэм. аб скасаваньні мандату камуністычнага пасла Гэнрыка Бітнэра, выбранага ў Лодзі.

Рэгуляміновая камісія знайшла, што гэты ўнёсак паданы фармальна і „аднамысна" прапануе аддаць справу важнасьці мандату п. Г. Бітнэра на разгляд Найвышэйшаму Суду.

Па дыскусіі, у якой вельмі цікавую пазіцыю заняло „Вызваленьне", дамагаючыся аддачы ўнёску ў Найвышэйшы Суд, прапанова рэгуляміновай камісіі прайшла большасьцю галасоў.

Наступна Сойм перайшоў да дыскусіі над бюджэтам Мін. Земляробства. Першы прамаўляў пасол **Сівец** (ББ), вылічаючы заслугі цяперашняга ўраду перад земляробствам.

Наступны прамоўца пас. **Фіялкоўскі** закрануў адносіны ўраду да грамадзкіх арганізацыяў.

„Нятыкальныя мядзьведзі".

Досыць ажыўленьня ў гэтую манатонную дыскусію ўнясла прамова ўкраінскага пасла **Шэкэрык Доныківа**. Гаворачы аб варунках жыцьця свайго жыхарства, ён, між іншым, сказаў так:

„Ваўкі й мядзьведзі робяць вялікія шкоды ў стадах быдла, а ёсьць распараджэньне, што ня можна забіваць матку-мядзьведзіху. Дык, значыць, „гуцуль" мусіць „элеганцка" ўвабрацца, пайсьці з візытай да мядзьведзіхі і запытаць у яе, ці мае яна дзетак... Даўней, каб адпудзіць мядзьведзяў, мы мелі пісталеты, набітыя порахам і папераЙ. Цяпер-жа мець пісталеты нам забаронена. Дык адгэтуль пастух мусіць зьняць перад мядзьведзем шапку і маліць у яго амністыі для свайго быдла".

Чародна прамаўляў міністар **Незабытоўскі** ў апраўданьне ад закідаў у справе мельёрацыі (асушкі балотаў), эксплёатацыі лесу і надужыцьцяў у надлясьніцтвах і т. п.

Па прамове рэфэрэнта Стадніцкага (ББ) дыскусія закончана. Наступае паўднёвы перарыў.

Зямельныя рэформы.

На папаўднёвым паседжаньні Сойм разглядаў бюджэт Зямельных Рэформаў. Рэфэрэнт пас. Маліноўскі крытыкаваў парцэляцыю, скардзячыся, што яна адбываецца пераважна з „wolnej ręki", дзякуючы чаму цана зямлі страшэнна вялікая, аж 5,000 зл. за гэктар (w Lubelskiem). Дык бедны селянін з гэтай парцэляцыі нічога не дастане.

Наступна прамаўлялі розныя паслы, між імі, пас. Гаўрылік, ад Бел. Пас. Клюбу „Змаганьне".

Прамову пасла Гаўрыліка падамо асобна.

У канцы прамаўляў, амаль ня 2 гадзіны, міністар Зямельных Рэформаў.

(15 паседжаньне).

Гвалтоўная „малацьба" бюджэту ў доўгіх паседжаньнях, трываючых па 2 разы ў дзень, ступнёва пачынае даваць суадказныя вынікі.

Чым далей, тым больш, заўважаецца, што лік прысутных паслоў зьмяншаецца, пры чым на тварах прысутных заўважваецца нейкая, быццам, змучанасьць і нэрвовасьць. Дзеля гэтага, часта замест дыскусіі над бюджэтам, пачынаецца дыскусія над чым іншым, навет і над асабістым.

Гэткай „асабістай" прычынай пачатку дыскусіі 15 паседжаньня Сойму, была справа пасла Выжыкоўскага (Выз.), якой надта вялікае значэньне прыпісываў пас. Палякевіч (ББ).

Справа ў тым, што на папярэднім (14-м) паседжаньні, у часе складаньня бюджэту Міністэрства Зямельных Рэформаў, пасол Выжыкоўскі (Выз.) назваў гэтае міністэрства „міністэрствам тамаваньня і нішчэньня зямельных рэформаў", на што моцна зарэагавал', як міністар, так і „адзінка".

Па атрыманьні стэнаграмнага адбітку, старш. Сойму сьцьвярдзіў, што ў стэнаграме няма гэтага звароту, на што з боку ББ пасыпаліся закіды ў сьцісласьць стэнаграмы. Не пачуваючыся да вымаўленьня гэтых слоў, пас. Выжыкоўскі кідае п. Палякевічу: „пан кламеш (лжэш)". Пас. Палякевіч закідае пас. Выжыкоўскаму сфальшаваньне стэнаграмы і абразу гэтага Міністэрства.

З другой стараны, пасол Вазьніцкі (Выз.) сьцьвярджае, што пачаткова ў стэнаграме фігуравала слова „тамаваньня", якое потым нехта замяніў на „нішчэньне" і жадае сьледзтва.

Мін. Станевіч. Магу сьцьвярдзіць словам гонару, што было „нішчэньня".

Пас. Вазьніцкі. Можам мець справу і з другім „словам гонару" і тады будзе квэстыя паміж „словам гонару п. міністра і п. Выжыкоўскага.

Палякевіч. І нашым словам гонару...

Пас. Вазьніцкі. Дык будзе справа абыдвух нашых слоў гонару.

Тут выступае маршалак Сойму і стараецца зьліквідаваць гэты „інцыдэнт, абвінавачваючы ў ім кепскую акустыку салі, якая зьяўляецца прычынай, чаму два ўрадоўцы Соймавага Бюра чулі зусім наадварот пачатак прамовы п. Выжыкоўскага.

Наступна прамаўляў яшчэ украінец пас. **Хруцкі**, пратэстуючы проці сканфіскаваньня ў укр. газэце „Діло" прамовы ўкраінскага пасла ў Бюджэтнай Камісіі і, толькі пасьля гэтага Сойм прыступіў да парадку дня.

Школьныя справы.

Справаздаўца, пас. **Стыпінскі** (ББ) закрануў брак арганізацыйных распараджэньняў (przepisów) аб устройстве (ustroju) школьных уладаў і брак уставы аб сярэдняй і прафэсіянальнай школе. Наступна прыводзіць цыфры аграмадных выдаткаў, якія будуць патрэбны дзеля таго, каб за 10 гадоў у Польшчы не забракла школаў і вучыцялёў.

Першы прамоўца ў дыскусіі—пас. **Чапінскі** (ППС), заняўся перадусім „непатрэбнымі" выдаткамі, а іменна выдаткамі на духавенства, жадаючы адлзяленьня касьцёла ад Дзяржавы і, уканцы зажадаў украінскага ўнівэрсытэту ў Львове. (Дзіўна да незразуменьня гэткія залёты пэпэса да ўкраінцаў!—Рэд.).

Пас. Енджэевіч выстаўляе заслугі ўраду ў школьнай справе.

Пас. Наліноўскі (Вызвал.) закрануў, між іншым, школьныя агітацыі ў школе і робіць закіды цяперашняму міністру, што ён зрабіў школе адну з найбольшых шкодаў, якую толькі можна было ёй зрабіць — гэта тое, што ён увёў залежнасьць вучыцялёў ад адміністрацыйных уладаў. Бо-ж ваявода можа навет у поўных выпадках скасаваць („zawiesić") распараджэньне міністра, а Рада Міністраў можа ўхваліць, што ў поўных выпадках ваявода можа ўзяць у свае рукі школьніцтва.

Школьніцтва і нацыянальныя меншасьці.

Папалуднёвая дыскусія пачалася з дыскусіі ў справе нацыянальных меншасьцяў.

Пачаў украінскі пасол Целевіч, які пратэставаў проці ўрадавых назоваў „рускі" і „русінскі" замест „украінскі". Наступна пратэставаў проці ўтраквістычных (двуязычных) школы і проці зьмяншэньня ўрадам ліку украінскіх школаў.

Міністар **Добруцкі** ў адказе на гэта заявіў, што школаў запраўды паменшала (на 613). але ня толькі ўкраінскіх, а навет і польскіх на карысьць утраквістычных, бо аднаклясавая польская школа дадучвалася з гэтай мэтай да двух ці больш клясовай украінскай, і з іх паўставала ўтраквістычная. (Дык хто-ж ад гэтага пацярпеў, як не украінцы.—Рэд.)

У далейшым працягу сваей прамовы міністар сказаў, што перагляданую школьных дэклярацый „можна было" (?) (чаго-ж цяпер „ня можна" зьбягаюць польскаму ўраду, а тым-болей міністру?—Рэд.). заўважыць адны і тыя самыя подпісы і за польскую школу і за украінскую.

Пас. Утта (немец) скардзіцца, што міністэрства нішчыць нямецкія „паўшэхныя" школы і то якраз у той час, калі цяпер у Нямеччыне заўважаецца радыкальная паправа польскай школы.

Мін. Добруцкі ў адказе на гэта сьцьвярджае, што ў Пазнанскім і Паморскім ваяводзтвах вучацца ў нямецкай мове больш 30.000 дзяцей. а нямецкіх на абшары дзяржавы, немцы маюць 180 школаў з 20.000 дзяцей і 80 прыватных школаў з 4.000 дзяцей (значыць, жыве яшчэ народная прыказка, што „багатаму (немцу) і чорт дзеці калыша" і другая,—у песьні, калі воўк схаціў іншае дзіця, „куды воўча бяжыш, на сферах" (беларуская).

Апрача гэтых, прамаўлялі пас. **Выгодзкі** (жыд) і пас. Каруза (бел. хадэк) і пасьля ім адказваў міністар.

У наступных прамовах галоўную роль грала прытыка залежнасьці вучыцялёў ад адміністрацыі і масавыя звальненьні і пераводы. А пас. Карнэцкі даў навет рад прыкладаў, што, апрача адміністрацыі, другой „падыдуючай" уладай ёсьць „koterje sanacyjne", так што ніхто цяпер з вучыцялёў ня пэўны свайго становішча.

Пасьля яшчэ цэлага раду прамоваў дыскусія перарвана.

Далейшыя дыскусіі будуць паданы у наступным нумары.

Прамова пасла з Беларускага Сялянска-Работніцкага Пасольскага Клюбу

д-ра Дварчаніна, сказаная ім у справе арыштаваньня пас. Стагановіча (з гэтага-ж клюбу) на паседжаньні Сойму 8 чэрвеня г. году.

Паны! Зноў здарыўся факт нябывалага пагвалчэньня правоў беларускіх сялян і работнікаў. Арыштаваны пасол Стагановіч, як даносіць прэса, за разьвіцьцё ім узмоцненай антыдзяржаўнай акцыі. Паны знаеце, што гэта няпраўда. Усе знаеце, што кожнае пасольскае веча, на якім гаворыцца, што селяніну патрэбна зямля, што паліцыя ўціскае народ, што падаткі выціскаюць апошні грош, што 4 пары „паўшэхных" беларускіх школ на ўсю Зах. Беларусь ня могуць задаволіць дзіцячых патрэбаў беларускіх сялян і работнікаў, што каждае слова аб гэтых крыўдах трактуецца дэфэнзывай і прадажнай прэсай, як „выврòтовая" дзеяльнасьць.

Мала было засуджэньня Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, Валошына і Мятлы, кожнага на 12 гадоў цяжкага вастрогу за верную абарону Беларускага народу, яго нацыянальных і сацыяльных праў. Цяпер паліцыя бяспраўна кінулася на пас. Стагановіча і здаецца, што пан Старшыня ня лічыць патрэбным інтэрвэньяваць (п. Голпіньскі: робіць увагі Старшыні). Я не зьвяртаю ўвагаў, толькі кажу, што стаўся такі факт. Бо-ж 21 арт. Канстытуцыі выразна кажа...

Віцэ-старшыня Вазьніцкі: Няхай пан узасадняе экстранасьць прапазіцыі, а гэтыя засьцярогі будуць разглядацца ў камісіі.

Пас. Дварчанін: 22 арт. Канстытуцыі кажа: „што праз увесь час мандату паслы ня могуць быць пацягнуты да судова-карнай і адміністрацыйнай адказнасьці, ані пазбаўленьня вольнасьці без пазваленьня Сойму".

Сойм ня даў дазволу на арышт. Старшыня не зажадаў звальненьня, Канстытуцыя пагвалчана. Што да гэтага, ня можа быць двох зданьняў. І гэтае пагвалчэньне Канстытуцыі праходзіць бяскарна і бяз ніякага ўражаньня, бо ходзіць аб прадстаўніку беларускіх сялян.

Мы знаем, што гэтыя паслы заўсёды наражаны на бяспраўі з боку адміністрацыйных уладаў. Памятаем, што без пазваленьня Сойму, бяз згоды старшыні, арыштаваны паслы Грамады: Тарашкевіч і іншыя. (Голас: чаго пан жадае (і сабе?).

Віцэ-маршалак Вазьніцкі. Прашу гаварыць аб тых паслах, якія ёсьць у прапазіцыі.

Пас. Дварчанін. Памятаем так-жа, што ў цяперашнім Сойме ўхілены кары усім паслам, за выняткам паслоў Стагановіча і Грэцкага. Прыпомню паном прабег галасаваньня. Калі галасавалі аб устрыманьні кары проці іншых паслоў, галасоў ня лічылі, але „лічылі" на вока (галасы)...

У гэтым выпадку, калі йшло аб паслох Стагановічу і Грэцкім, вырашыла такая самая большасьць, аднак галасы лічылі. Адзін лічыў стаячых паслоў, другі лічыў сядзячых. Паслы, каторыя стаялі, селі па пералічэньні і іх лічылі нанава.

Віцэ-маршалак Вазьніцкі. Прашу гаварыць аб экстранасьці прапазіцыі, астаецца пану яшчэ 2 мінуты.

Пас. Дварчанін. Гэткім спосабам атрымана больш сядзячых галасоў, г. е., проці п. Стагановіча, і навет пан Старшыня, як памятаю, зьвярнуў тады на гэта ўвагу, зьвяртаючы ўвагу аднаму з паслоў, які галасаваў ужо 2 разы. Чаму гэтак зроблена? Знаем, што зроблена гэта дзеля таго, што гэтыя паслы ёсьць паслямі беларускіх сялян і работнікаў, а ў адносінах да прадстаўнікаў сялян і работнікаў, як аказваецца, пазваляюцца, усялякія гвалты.

Віцэ-маршалак Вазьніцкі. Пане пасол, час прамовы пана пасла мінуў, прашу кончыць.

Пас. Дварчанін. І цяперашні арышт пасла Стагановіча ёсьць новы крычучы гвалт над Беларускім народам. Што скажа на гэты гвалт Сойм? Ад імя майго Клюбу жадаю разгледжаньня экстранай прапазіцыі аб задзяржаньні карных паступаньняў проці паслоў Стагановіча і Грэцкага. Дамагаюся также, каб Сойм зажадаў звальненьня цяпер-жа пасла Стагановіча. Выкажыцеся паны адкрыта, хай Беларускі Народ ведае, што ён мае думаць аб Сойму. Адначасна жадаем пастановы цяпер-жа, без адасланьня ў камісію, па 18 арт. Рэгуляміну.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Адказная нота Польшчы Радам.

Польскі Урад выслаў у Маскоўскі Камісарыят Загранічных спраў ноту. У адказ на ноту Чычэрына і Багамолава ў справе замаху на Лізарова. У гэтай ноце польскі ўрад асьвядчае і прыпамінае, што ён выразіў жаль з поваду гэтага замаху, і зьвяртае ўвагу на канечную патрэбнасьць унемажлівіць „трэцім асобам" магчымасьць наражаць на пагоршаньне польска-радавыя адносіны і на выданьня ў гэтай мэце сваі распараджэньні.

Маршалкаўскі Суд у справе п. Маліноўскага.

5 г. м. адбылася першае паседжаньне соймавага суда, скліканага па просьбе пасла Маліноўскага (ППС) ў справе разгляду (zbadania) закідаў А. Бэлцікоўскай.

Як ведама, Бэлцікоўская (былая супрацоўнічка дэфэнзывы) закідае пас. Маліноўскаму доўгія гады супрацоўніцтва з дэфэнзывай і што ён ужываў свайго партыйнага і пасольскага становішча дзеля інфармаваньня дэфэнзывы. Гэты суд, пішуць газэты, будзе разглядаць ці запраўды былі „няэтычныя (!?) факты супрацы ў дэфэнзыве, якія закідае п. Маліноўскаму А. Бэлцікоўская. А ці-ж само па сабе супрацоўніцтва ў дэфэнзыве ёсьць „неэтычным"—суд разглядаць ня будзе.

Значыць, аб гэтым маршалкоўскі суд будзе маўчаць, „як вады ў рот набраўшы", — бо мова—серабро, маўчаньне—золата — карацей, залатая згода".

Прысуд над камуністкай.

Акружны Суд у Сасноўцу засудзіў на 4 гады цяжкага вастрогу з пазбаўленьнем праў камуністку нейкую С. Варшаўскую за антыдзяржаўную дзеяльнасьць і за арганізаваньне камуністычных саюзаў (związków).

Забастоўка ў відзэўскай мануфактуры.

У фабрыках відзэўскай мануфактуры ў Лодзі між работнікамі і дырэкцыяй дайшло да паважнага непаразуменьня на эканамічным грунце. Скуткам гэтага 900 работнікаў кінула працу. Але справа ня спынілася. Дырэкцыя адмовіла на 2 тыдні працу 2.400 работнікам. Газэты дадаюць, што гэтае не„паразуменьне" можа прыняць вельмі вострыя формы — закончыцца агульнай забастоўкай.

Забастоўка ў каменаломнях.

У татранскіх каменаломнях забаствала 800 работнікаў з прычыны невыплачваньня платы.

Заграніцай.

Новыя рэвізіі ў радавых установах у Англіі.

Англійскі ўрад загадаў зрабіць дакладны агляд усей дзейнасьці радавых банкаў і іншых установаў у Англіі, шукаючы тых шляхаў, якімі быццам плывуць у Англію радавыя грошы на камуністычную агітацыю ў краі. Трэба лічыць гэтыя рэвізыі—падрыхтаваньнем англійскага ўраду да выбарнай кампаніі, у якой, відаць, урад баіцца асабліва акцыі камуністаў. Англійская прэса піша — з прычыны гэтых рэвізіяў — што яны зусім не павінны псаваць гандлёвыя стасункі між Англіяй і Радамі. Навет, калі англійскі урад—у выніку рэвізыі банкаў—вышле сьцяг радавых агентаў з краю, дык усё ж няма мовы навет аб зачыненьні гандлёвых ці фінансавых установаў СССР, створаных на англійскай тэрыторыі.

Вялікія манэўры ў Ленінградзе.

2-га чэрвеня мелі пачацца ў Ленінградзе вялікія 2-дзённыя манэўры, якія маюць прадставіць абарону места — проці налёту варожых аэрапланаў, кідаючых бомбы з атрутнымі газамі. Нападу робяць 2 эскадры, складаючыся ўсяго з 60 самалётаў. У патрэбны мамэнт места павінна быць закрыта вялізарнымі хмарамі штучнага дыму. Уначы забаронена запаляць агонь.

Аўстрыяцкія ўлады не выдаюць Вэнгрыі Бэля-Куна.

Аўстрыяцкі ўрад паведаміў Вэнгрыю, што ня можа — на падставе існуючых у Аўстры законаў — выдаць вэнгерскім уладам Бэля-Куна (былога камуністычнага дыктатара Вэнгрыі, пасьля ўцёкшага ў СССР, а нядаўна вярнуўшагася ў Вену ды там арыштаванага). Адмову сваю аўстрыяцкі ўрад матывуе тым, што Бэля-Кун разглядаецца ім, як вылучна палітычны праступнік. Як ведама, вэнгерскі ўрад дамагаўся выдачы Куна, даводзячы, што ён—ня толькі палітычны, але і ўгалоўны праступнік.

Англійска-турэцкія перагаворы.

Даўшы час Турцы падпісаць трактат з Афганістанам, Англія вельмі спрытна распачала цяпер перагаворы з Турцыяй—у справе цясьнейшага паразуменьня. Як ведама, турэцка-афганскі трактат дае Турцы значныя ўплывы ў Афганістане (арганізацыя арміі і г. д.), дык Англія і жадае выкарыстаць гэтыя абставіны, захапіўшы з свайго боку ўплывы ў Турцы, каб—праз яе — уплываць на Афганістан. Бо-ж ведама, якую вялізарную вагу мае „афганская брама" з СССР да Індыі для Англіі.

Нямецкія сацыял-дэмакраты твораць урад.

6-га чэрвеня распачаліся нарады галоўнай управы сацыял-дэмакратычнай партыі, якія маюць галоўнай мэтай справу стварэньня ўраду.

Радыкальнае крыло партыі, як ведама,— проці прыняцьця ў склад урадавай коаліцыі „людоўцаў" Штрэзэмана, — як прадстаўнікоў буйнай буржуазіі. На становішча канцлера (прэм'ера) намечаны ўжо, здаецца, згодна, пасол Мюллер-Франкэн, прадстаўнік сярэдняга кірунку партыі. Пас. Мюллер мае быць у пачатку тыдня запрошаны прэзыдэнтам Гіндэнбургам, які афіцыяльна даручыць яму, як прэм'еру, стварэньне габінэту.

Сялянскі збор у Югаславіі.

Пасьля 100-тысячнага зьезду сялянства ў Румыніі і Чэха-Славакіі цяпер такі-ж самы збор дэлегатаў сялянства з усяго краю мае адбыцца ў Югаславіі. Усе гэтыя краі—пераважна-сялянскія і Славакія, — амаль ня выключна сялянская. Дык трэба адзначыць у жыцьці сялянства—шуканьне новых шляхаў дзеля здабыцьця сталага ўплыву на палітыку ўраду, уплываў, суадказных ролі сялянства ў агульнай эканоміі дзяржаўн. жыцьця.

Тэлеграма з Белграду кажа, што ўрад „зусім неспадзявана (?) даў дазвол на скліканьне вялізарнага збору сялянства, арганізаванага ў сялянска-дэмакратычную партыю. Кангрэс мае адбыцца ў Сузаку, робяцца падрыхтаваньні па ўсяму краю, каб зьезд паказаў запраўдную магутную сілу арганізаванага сялянства.

Вестка аб заняцьці Пэкіна—пацьверджана.

З Шанхаю пацьвярджаюць вестку аб заняцьці Пэкіну паўдзённымі арміямі. Пэкін заняты без праліву крыві.

Пасьля Пэкіну—Мукдэн?

Пасьля ўзяцьця Пэкіну перад паўдзённай арміяй стаіць вельмі важная, амаль не трагічная задача: што рабіць далей—ці ісьці далей, здабываць Манчжурыю, якую Японія лічыць амаль не сваей, дый тым самым распачынаць ужо яўную барацьбу з Японіяй; ці пакуль-што спыніцца на здабыцьці сталіцы, на зьліквідаваньні 2 уладаў у Кітаі дый распачаць працу аб'яднаньня і арганізацыі таго вялізарнага абшару, якім валадае цяпер без канкурэнтаў нацыянальны ўрад—Куомінтангу.

Ня будзем пакуль-што гадаць аб тым, на што рашыцца пераможца, падчыркнем толькі, што новы валадар кітайскай сталіцы мае і ўсе праўныя перавагі ў споры з Японіяй за Манчжурыю, мае і падтыманьне наймагутнейшых дзяржаў у Кітаі: СССР і Амэрыкі. Амэрыканскі ўрад выразна падчырквае, як сваімі заявамі таксама і актамі, што не прызнае ніякага права за Японіяй распараджацца ў Манчжурыі, адмаўляецца навет прымаць учасьце ў супольнай з усімі эўрапэйцамі акцыі ў справе абароны чужаземных кварталаў Пэкіну і Цянь-Дзіна. За тое і новы нацыянальны ўрад, ці галоўнае камандаваньне паўдзённай арміяй, адносіцца да амэрыканцаў з асаблівай пашанай. На вострай канкурэнцыі між Амэрыкай і Японіяй новая кітайская ўлада можа зыскаць вялікія пасьпехі ў канчальным аб'яднаньні краю. Справа аднак-жа настолькі вострая, што пахне амаль не вайной між Амэрыкай і Японіяй. Ня дасьць маху пэўне-ж і СССР, але ўсімі мерамі падтрымае новую кітайскую ўладу, як падтрымліваў ваенную акцыю ген. Фэнга, як аб гэтым пісалі газэты.

З гэтага відаць, што кітайская справа яшчэ далёка ня скончана... Але—канец Чанг-Тсо-Ліна, які даўно прадбачыла беларуская прэса, завяршае вялізарны, асабліва цяжкі пэрыяд кітайскага змаганьня.

Цяпер—пасьля канца агіднага здрадніка, якога кінула ўрэшце сама Японія, — пасьля ўтварэньня адзінага кітайскага ўраду, Кітаю будзе шмат лягчэй весьці барацьбу і з пасобнымі чужаземнымі імпэрыялістамі.

Чанг-Тсо-Лін у Мукдэне. Замах на яго па дарозе.

4 чэрвеня ў Мукдэн — пад японскую ахову—прыбыў Чанг-Тсо Лін. У часе падарожы з Пэкіну ў Мукдэн на цягнік Чанг-Тсо Ліна зроблены замах. Калі цягнік праяжджаў праз адзін з мастоў, раптам выбухнула падкладзеная пад мост бомба.— 4 канцавыя вагоны разьбіты ў шчэпкі. Шмат людзей забіта ды пакалечана. Раненыі і сам Чанг-Тсо-Лін.

Памёр прэзыдэнт Кітайскай Рэспублікі.

4 чэрвеня памер у Цянь-Дзіне прэзыдэнт Кітайскай Рэспублікі Лі-Юан-Хунг.

Канец Чанг-Тсо-Ліна.

Японская прэса даносіць, быццам Чанг-Тсо-Лін, ранены ў часе замаху на цягнік, якім ён уцякаў з Пэкіну ў Мукдэн, памёр. Памёр таксама ад ранаў у часе катастрофы цягніка ехаўшы разам з Чанг-Тсо-Лінам яго галоўны генарал Ву-Чанг-Шэнг, губэрнатар прав. Эй-Юн-Кіян. Паміраe з перапуду ў часе выбуху цягніка і прэм'ер апошняга пэкінскага ўраду.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

Прамова адв. праф. Пятрусэвіча.

Паны судзьдзі! 10 сакавіка 1864 г. вось тут, на гэтым пляцу, перад гэтым-жа будынкам, у якім цяпер адбываецца працэс Бел. Сял.-Раб. Грамады, зьгінулі мучанікі „за нашу і вашу вольнасьць". На гэтым пляцу зьгінуў Кастусь Каліноўскі, першы выдавец беларускае часопісі пад наз. „Мужыцкая Праўда". Каліноўскі пакінуў па сабе тэстамэнт, у якім заклікае беларускі народ да злучэньня свайго лёсу з паўстаньнем, асьцерагаючы адначасна перад найстрашнейшым ворагам—Масквой.

Але паўстаньне было ўтоплена ў моры крыві. Тыя, што змагаліся „за нашу і вашу вольнасьць"—знайшліся ў вастрогах і тайгах Сыбіры. А іхняе прышлае пакаленьне зьмяніла лёзунг „за нашу і вашу вольнасьць" на іншы—лёзунг працы арганічнае. Бо гэтага вымагала хвіля.

Я цьвярджу, паны судзьдзі, што каб навет зусім ня было беларускага руху, дык і то трэба было-б яго выклікаць. Але гэты рух нарадзіўся сам і першымі піянэрамі яго была польская шляхта. Ці гэта будзе Рыпінскі, ці Чачот, ці Дунін-Марцінкевіч—усе яны былі прадстаўнікамі гэтага маладога руху і разумелі, што пачуцьцё народнае асаблівасьці трэба абудзіць, бо на народзе беларускім усё больш і больш выгрывала Масква.

Паны судзьдзі, пакуль будзе існаваць Польшча, датуль будзе і змаганьне паміж Варшавай і Масквой. І мы не павінны забывацца, што паміж Масквой і Варшавай ляжыць вялізарная раўніна, заселеная беларускім народам.

Бяз сумліву, паканае той, хто будзе мець за сабой беларускі народ. А ці-ж беларускі народ варожа спатыкаў польскія войскі? Не, спатыкаў іх з хлебам і сольлю.

Беларускія дзеячы таксама орыентаваліся на Польшчу. Луцкевіч едзе да Парыжу. Былі ўсе варункі, каб пакапаў Рым, а не Візантыя. Але што Польшча зрабіла ў гэтай палючай справе? Нічога. Я не зьяўляюся максымалістам і мне сяньня выдаецца гасла „за нашу і вашу вольнасьць" максымальным. Але я цьвярджу, што пакуль Польшча існуе, яна мусіць мець „Крэсы", бо гэта — квэстыя яе існаваньня. І канстытуцыя—гэта ня кусок паперы. У ёй ёсьць арт. 109 і 110. Калі народ беларускі хоча мець свае школы, дык трэба іх яму даць. Трэба памятаць, што ў гэтай мове быў пісаны Літоўскі Статут, гэта вялікая кадыфікацыя, хоця прадстаўнікоў гэтага народу пракурор назваў „barbarzyńca". Тварэньне масавых працэсаў добрых рэзультатаў не дае.

П. пракурор, кажучы аб словах Пэтронія да Вініцыя (раман Сянкевіча „Quo Vadis") „ты шчасьлівы", забыўся дадаць, што ён таму чуўся шчасьлівым, што зьяўляецца рымскім паўнапраўным грамадзянінам. А як-жа можа чуцца шчасьлівым той, хто гэтага аб сабе сказаць ня можа; той, над кім была распастата апека дакучлівая і нэразумная. Гэтая апека зьяўляецца мамэнтам, які найбольш зашкодзіў і папсуў адносіны паміж польскай дзяржаўнасьцю і беларускім народам. Квэстыя беларуская стаіць у-ва ўсёй сваёй велічыні. Аб павазе яе сьведчыць хоць-бы лічба 200 тысяч (?) галасоў, адданых на беларускія сьпіскі падчас апошніх выбараў у Сойм. З гэтым трэба лічыцца.

Далей праф. Пятрусэвіч у глыбокіх і навуковых вывадах, апіраючыся на Кодэксах іншых дзяржаў і на праўна-судовай практыцы, адкідае магчымасьць абвінавачваньня ў гэтай справе па 102 арт. К. К.

П. пракурор, — кажа праф. Пятрусэвіч, — чытаючы „Quo Vadis", не зразумеў добра яе зьместу, бо інакш пераканаўся-б, што права дамаганьня амністыі ёсьць правам абсалютным. Ці-ж сам Пэтроні ня змушае Нэрона, каб даў амністыю? А калі ходзіць аб помач вязьням, дык ці-ж Пэтроні пакідае Лігію без апекі?

Абарона і палітычныя працэсы.

Я вельмі дзякую п. пракурору, што не падаў прозьвішча адваката, які прыходзіў з помачу палітычным вязьням. Адв. Родзевіч цешыцца такой павагай, што гэта-б яму шкоды не прынясло. Ён можа толькі ганарыцца, што выступаў у палітычных працэсах па просьбе беларускіх паслоў. Ці п. пракурор можа цьвердзіць, што ніхто з гэтага працэсу ня выйдзе жывым? Калі не, дык мы тут зьяўляемся патрэбнымі. Калі да лекара ў хвілі небясьпекі прыходзіць хворы—ці лекар можа адмовіцца ад помачы яму? Зусім непатрэбна дзеля гэтага знайшоўся ў акце абвінавачваньня параграф аб амністыі. Усе мы добра ведаем, чым была шлісэльбурская турма. У ёй хавалі людзей. Там ня было людзей, а толькі нумары. І вось кн. Дундукава пасьвяціла сваё жыцьцё, каб ратаваць людзей, якія туды папаліся. І ёй трэба дзякаваць, што тут у Вільні мы маем прафэсара на U. S. B., які, хоць прасядзеў 20 гадоў у гэтым вастрозе, усё-ж такі быў ратаваны для жыцьця і навукі.

Абв. Астроўскі і Бел. Банк.

Праф. Пятрусэвіч характарызуе папярэднюю дзейнасьць Астроўскага і абгаварвае паказаньні сьведак, датычучыя Астроўскага. Пасьля пераходзе да Бел. Банку.

Кожная арганізацыя—кажа праф. Пятрусэвіч—ці то нарадовая, ці грамадзкая, палітычная імкнецца да стварэньня асяродка гаспадарчага жыцьця. Нічога дзіўнага, калі і беларускае грамадзянства імкнулася да стварэньня свайго Банку. А што імкнулася, сьведчыць тое, што помач сваю ураду Сікорскага паставіла ў залежнасьць ад выданьня канцэсіі на банк. Калі-ж канцэсіі не атрымала, дык залажыла свой Банк каапэратыўны. Усяго Банк выдаў 500 пазычак. І гэта называецца падкупам усей беларускае люднасьці! Гэта ёсьць непатрэбная апека над кожным пачынаньнем беларускага грамадзянства. Была тут вельмі цікавая экспэртыза Банку, зробленая пракурорам Раўзэ, які прыйшоў да вываду, што банкавыя сумы — гэта тая сума, якая была атрымана ў Гданску. Гэта вельмі дзіўная бухгальтэрыя. Прак. Раўзэ казаў, што Коўш быў дрэнным бухгальтэрам, бо яму перашкаджала тэолёгія. Я ня ведаю, што перашкаджала прак. Раўзэ зрабіцца добрым бухгальтэрам, бо ён ёсьць дрэнным. Ня можна рэчаў, ня маючых супольнае меры, дадаваць, як напр. золата да людзей і пробаў да дзерава. Экспэрты сьцьвердзілі, што ніякіх фікцыйных запісаў ня было, а пракурор гэтаму ня верыць. Абвіненьне, што Банк паўстаў, каб падкупляць беларускую люднасьць, беспаваротна разьвяваецца. Пасьля праф. Пятрусэвіч абгаварвае справу кантакту з Банкам ў Рызе і зьбівае закіды, быццам вучні белар. гімназіі з віны Астроўскага вялі дэструкцыйную працу.

Квэстыю учасьця абв. Астроўскага ў гданскай канфэрэнцыі праф. Пятрусэвіч абгаварвае пры зачыненых дзьвярох.

Паны судзьдзі,—кажа праф. Пятрусэвіч па абвешчаньні яўнасьці—прыступаю да закідаў, пастаўленых абв. Шнаркевічу, Сакалоўскаму, Стоціку. Калі адкінуць паказаньне Бабіча, дык проці іх няма ніякіх закідаў.

Кім ёсьць Бабіч.

Асобу Бабіча добра ахарактарызаваў мой калега Сьмяроўскі. Бабіч, паны судзьдзі,—гэта натарычны ілгун. Ен ілжэ і ломіць прысягу на кожным шагу. Яго ўчасьце на курсах дывэрсантаў у Лошыцы, учасьце ў кангрэсе камінтэрну, у канфэрэнцыях польскае і белар. кам. партыі — гэта адзін беспарарыўны ланцуг маны. І я гэта з пачуцьцём адказнасьці падаю пракурорскаму ўраду. Бабіч выступае ў цэлым радзе працэсаў, але на Суд не зьяўляецца. Ен кажа аб сабе, што зьяўляецца будаўнічым — хіба што ў тым сэньсе, што будуе масавыя працэсы. Адносна да абв. Шнаркевіча, Сакалоўскага і Стоціка няма, ня толькі доказаў віны, але навет падазрэньняў.

Абв. Луцкевіч.

Мая роля зьяўляецца тут і лёгкай, і труднай. Не прадстаўлена проціў яго ніякіх закідаў. Ен быў усім у руху беларускім. Калі-б навет быў рэдактарам і часопісі канфіскавана за яго артыкулы, дык і тады яго можна-б было абвіняць толькі па 129 арт., але ніколі па 102 К. К. Луцкевіч да Грамады не належаў і пратэставаў проціў ідэнтыфікацыі яго асобы з Грамадой. Закідваецца яму ідэёвае кіраўніцтва, але тварцы ідэёвых рухаў, не бяручыя ўчасьця ў практычнай дзеяльнасьці, ня могуць быць пацягнуты да адказнасьці. Ці Леў Толстой, карыфэй анархізму, адказваў за свае ідэі? Луцкевіч, як неналежачы да Грамады, ня можа за яе дзеяльнасьць панасіць ніякае адказнасьці.

Луцкевіч ад 1922 г. выходзіць з палітычнае арэны, бо хварэе на сухоты. Ен неадабываў сабе засобаў гандлем старасьвецкімі рэчамі. Пракурор казаў аб Луцкевічу, што ён зьяўляецца палякажэрцам, камуністым і г. д. Скуль пан пракурор узяў гэтыя дофініцыі? Усё гэта паходзіць з палемічнага артыкулу новае фармацыі беларуса—Рагулі, але пан пракурор не дачытаў гэтага артыкулу да канца, бо заканчэньне было гэткае: „Пане Луцкевіч, за тваю дзеяльнасьць Польшча паставіць табе памятнік, а народ белар. уб'еўць кол у магілу". Гурын сцьвярджае, што сфэры камуніст. адносіліся да Луцкевіча заўсёды варожа і хацелі яго пазбыцца.

Можа ён і зьяўляецца Макіявэльлем, можа навет бел. Бісмаркам, але за мыслі скрытыя ня можна судзіць. Калі аднаго разу рабілі рэвізію на граніцы ў валізцы Гэйнэ, дык ён сьмяяўся пасьля, што шукалі забароненых мысьляў, якіх ён мае поўную галаву, у валізцы. Або ізноў гэткія закіды, як што ў Луцкевіча знойдзена дзьве кніжкі, выданыя ў Сав. Расеі? Ці гэта праступак? Або ізноў гісторыя з эвангеліяй пабеларуску? Гэта-ж дапраўды жарт, які павінен знайсьціся ў „Cyruliku" або „Маланцы". Паны судзьдзі, хачу падзяліцца з вамі ўвагамі, якія мне насунуў пераклад праз праф. Глезэра кн. „Працэс Ісуса Хрыста. Мы прывыклі лічыць расьпяцьце Хрыста за морд. І вось дзіва! Працэс адбыўся пры спаўненьні ўсіх фармальнасьцяў жыдоўскага права. Аднакжа ўся гісторыя, уся людзкасьць не сумляваецца, што зроблена вялікая памылка, што ўкрыжавана Бога.

У гэтых матэрыялах, якія сабраў цяперашні працэс, прышлы гісторык ня знойдзе праўды,—бо яе тут няма.

Прамова адв. Абрамовіча.

Высокі Суд! Чытаючы акт абвінавачаньня, кідаецца ў вочы шырокая характарыстыка камінтэрну і розных іншых камуністычных арганізацыяў. З гэтай характарыстыкай можна згадзіцца. Але акт абвінавачаньня выражае пераконаньне, што ўсе гэтыя пастановы — загады ўпоены ў Грамаду. Бяз сумляваньня, кам. партыя імкнулася да апанаваньня гэтае арганізацыі. Але доказаў, што гэтак істотна было, не прадстаўлена.

Пракурор паклікаецца на пастановы кам. партыі заграніцай, але-ж гэта не зьяўляецца доказам. Рэчай ўсім вядомай зьяўляецца тактыка кам. партыі, якая палягае на тым, каб зьвязацца з легальнымі палітычнымі арганізацыямі.

Аб гэтай тактыцы мы ўсе ведаем. Мы бачылі дэманстрацыі няпрошаных гасьцей. У іх інтарэсе ляжыць, каб абвінавачаных прыціснуць як-найбольш. Мне навет здаецца, што і забойства Гурына трэба прыпісаць вонкавым чыннікам, іх сьвядомым замерам пашкодзіць абвінавачаным. Але, каб можна было казаць аб віне Грамады, трэба мець акт выражэньня волі з яе боку. Гэтага-ж няма. Пракурор нам ня можа даказаць паразуменьня Грамады з Камінтэрнам.

Акт абвінавачаньня бачыць саюз Грамады з Камінтэрнам ў сходстве праграмаў. Калі браць пад увагу пытаньне нацыянальнае, дык, паводле зданьня пракурора, маем тут ідэнтычныя праграмы і толькі нязначнае перакручэньне. Але на якой падставе ставіцца закід перакручэньня?

Лёзунг самаазначэньня народаў быў выкінуты яшчэ задоўга перад вайной; з яго карысталася Польшча, на падставе яго адбываліся плебісцыты; самаазначэньне народаў—гэта адзін з падставовых пунктаў дэкларацыі Вільсона. Ці-ж можна ў гэтым гуманітарным лёзунгу бачыць лучнасьць з камунізмам? Лёзунг злучэньня беларускіх земляў мае быць доказам лучнасьці з камунізмам? У тым часе, калі Польшча паўстала з трох забораў, казаць аб гэтым, як мне здаецца, зьяўляецца немагчымым.

Стварэньне моцнага зьвязку сацыялістычных народаў—гэта-ж лёзунг II Інтэрнацыяналу. Гэтак сама асвабаджэньне працоўных з пад ярма капіталістаў зьяўляецца гаслам усіх сацыялістаў, а ня толькі камуністычнай ўласнасьцю.

Тэрмін „Сял.-Раб. урад" гэтак сама часта падкрэсьліваецца, як доказ сувязі з камунізмам. „Robotnik" штодзень гэтае гасла друкуець. Гэткае-ж гасла высоўваюць усе народныя партыі, бо пад „сял.-раб. урадам" трэба разумець урад, якія прадстаўляў інтарэсы сялян і работнікаў. Мы бачылі прыклады гэткіх урадаў у Польшчы, напр. Марачэўскага, Вітаса і г. д.

Дамаганьне падзелу зямлі бяз выкупу пракурор так сама лічыць за доказ сувязі з камунізмам. Але-ж гэта зьяўляецца гаслам усіх народных партыяў, нічога супольнага з камунізмам ня маючых. І ніхто за гэта іх ня цягне да адказнасьці. Чырвоны сьцяг Грамады (гэта выдрукавана ў акце абвінавачаньня грубымі літарамі) пракурор таксама лічыць за доказ сувязі з камунізмам. Я не сумляваюся, паны судзьдзі, што кожны з седзячых тут на лаве абвінавачаных аднолькава шануе сьцяг бела-чырвона-белы, як Паляк бела-чырвоны. А аднак-жа PPS. ідзець пад чырвоным сьцягам. Ці PPS-цы мала злажылі ахвяраў у барацьбе за непадлежасьць Польшчы і з гэтым самым камунізмам?

Ці-ж усе гэта зьяўляецца выключнай ўласнасьцю Камінтэру? Ці гэта пярэчыць пачуцьцю народнай асаблівасьці? Не, паны судзьдзі, гэта рэчы, якія не выключаюцца, але папаўняюцца. Ці „Wielki Mistrz" зьяўляецца нейкай містычнай сілай, што калі дзе што дзеецца, дык па яго загаду? Калі так, дык істотна трудна яму апірацца.

Калі ў актах справы ня маем доказаў, дакумэнтаў, сцьвярджаючых сувязь з бальшавікамі і калі гэтага ня сьцьвердзіў судовы працэс, дык абвіненьне з 102 арт. К. К. мусіць адпасьць.

Наша хроніка.

По загаду Старосты Гродзкага на места Вільню канфіскаваны № 4 газэты „Зара Працы" за „Дэкларацыю Белар. Сялянска-Работніцкага Клюбу", прачытаную пас. д-рам. Дварчанінам на паседжаньні Сойму 30 траўня г. году.

Пасольскі мітынг у Вільні. Па запрошаньню ППС-лявіцы паслы Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу Я. Гаўрылік і Ф. Валынец зрабілі ў Вільні 3 чэрвеня справаздаўчы мітынг, які аднак быў перарваны паліцыяй, якая ў сярэдзіне прамовы пасла Гаўрыліка прыказала лічнай работніцкай публіцы разыйсьціся.

Арыштаваньне пасла Стагановіча. 4 г. м. ў Навагрaдку арыштаваны пасол Стагановіч, з клюбу: „Змаганьне за Інтарэсы Сялян і Работнікаў" (цяпер: Беларускі Сялянска-Работніцкі Пасольскі Клюб).

Пасла Стагановіча арыштавана скуткам таго, што Сойм большасьцю галасоў перад гэтым адкінуў просьбу п. Стагановіча аб звальненьні яго ад судоў на час яго пасольскага мандату.

Няма ніякага дзіва ў адносінах да праўдзівых прадстаўнікоў беларускіх сялян і работнікаў, бо гэта-ж ні які-небудзь Рагуля.

У пятніцу, 8 траўня, справа пасла Стагановіча праз Бел. Сял.-Раб. Клюб была пастаўлена на парадак дзенны. Паскольку ў такім самым палажэньні знаходзіўся і пасол Я. Грэцкі — пастаўлена справа перагляду адношаньня Сойму да ўстрыманьня судовай расправы ў адносінах да абодвух. Бараніў ўнёсак пасол д-р І. Дварчанін. Проці выступаў пасол Падоскі з Б. Б. і віцэ-міністар справядлівасьці Цар.

Унёсак д-ра Дварчаніна прыняты 103 галасамі проці 84 і адасланы ў камісію для аканчальнага разгляду ўсяе справы.

Прамову д-ра Дварчаніна зьмесьцім у наступным нумары.

Прывітаньне Беларускага паступовага студэнства ў Празе засуджаным сяброн Бел. Сял.-Раб. Грамады. У Рэдакцыю надыйшло прывітаньне Беларускага паступовага студэнства ў Празе засуджаным сябром Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады за іх пэўнае і бадзёрае захаваньне на судзе. Прывітаньне канчаецца выражэньнямі поўнае веры і надзеі ў аканчальнае вызваленьне беларускіх працоўных гушчаў, і заклікам да салідарнасьці працоўных.

З пэўных прычын яго зьмясьціць ня можам.

Новыя кнігі. Выйшлі з друку і прадаюцца ў-ва ўсіх беларускіх кнігарнях наступныя кнігі:

1. **Крапіўніцкі М. „Па рэвізіі".** Камэдыя ў 1-эй дзеі. Перароблена з украінскага. Выд. Т-ва Бел. Школы.
2. **Карусь Каганец „Модны шляхцюк".** П'еса ў 1-эй дзеі. Выданьне Т-ва Бел. Шк. 32 стар. вял. фар. Цана 60 гр.
3. **М. Крапіўніцкі. „Пашыліся у дурні".** Жарцік у 3-х дзеях, 32 стар. вял. фар. Цана 60 гр. Выданьне Т-ва Бел. Школы.
4. **Марк Твэн. „Прынц і жабрак".** Повесьць для юнацтва 215 старонак вялікага фармату. Цана 5 зл. „Віленскага выдавецтва" Б. Клецкіна.
5. **Б. Друцкі-Падбярэзкі.** Байкі, гумар, сатыры з рысункамі ў тэксьце, сшытак І і ІІ, 64 стар. сярэдняга фарм. Цана 1 зл. 50 гр. „Віленскага выдавецтва" Б. Клецкіна.

Галоўны склад — Беларуская Кнігарня Беларускага Выдавецкага Т-ва. Вільня, вул. Вострабрамская № 1.

„Маланка" вочы коле. Пракуратура Віленскага Акружнога Суда зьвярнула ў рэдакцыю „Маланка" 17 экзэмпляраў № 5 часопісі „Маланкі", адрасаваных палітычным вязьням на „Лукішках". Цікава, што пракуратура не падае ніякіх матываў, чаму апалітычная гумарыстычная часопісь „Маланка" ня можа быць даручана яе платным падпішчыкам, якія маюць няшчасьце гасьцінна прабываць на „Лукішках".

Крывавая бойка натоўпу з паліцыяй. „Słowo" ў № 122 падае дужа цікавы факт, які здарыўся ў м-ку Забярэзьзе, Валожынскага павету, на другі дзень Сёмухі (каталіцкай). Справа ў тым, што, як падае „Słowo", каля 600 чалавек натоўпу, пераважна вясковай моладзі з суседніх вёсак, кінулася з каменьнямі на паліцыю і 2-х салдатаў, якія ў гэты час арыштоўвалі будучага ў вотпуску (na urlopie) салдата нейкага Пранцішка Кадэрву. У часе, калі натоўп акружыў паліцыю, пад ударамі каменьняў упаў заліты крывёю „przodownik" Камароўскі. Паліцыя пачала страляць і натоўп рассеяўся, астаўся толькі ранены паліцыяй Язэп Садоўскі, з вёскі Нэровай, ды „przodownik".

„Новы акт камуністычнага тэрору". Пад такім загалоўкам Rzeczplita ў № 161 падае такую заметку: „Няведамыя спраўцы атруцілі ў загадачных варунках Івана Гурскага, абвінавачванага ў вялікім працэсе 136 сяброў КПЗБ у Беластоку. Гурскі ў сваім часе сам зьвярнуўся ў паліцыю і выдаў многа (wielu) сяброў партыі, дзеля чаго і быў лічаны камуністамі за правакатара, што і выявілася ў паказаньнях і асьведчаньнях абвінавачаных ў Беластоцкім працэсе. Па забойстве Гурына і паліцыйнага „выведоўцы" ў Горадні, гэта ўжо трэці акт тэрору беларускіх камуністаў у апошнім месяцы".

Арыштаваньне „шпікоў" у Віжанах. Газэты падаюць, што апошнімі днямі на польска-літоўскім пагранічы арыштавана кабету-шпіка, быццам кур'ерку літоўскага шпікоўскага аддзелу. У сувязі з гэтым арыштавана яшчэ „колькінаццаць" чалавек.

Узрост безрабоцьця ў Беласточчыне. У Беластоку спынілася суконная фабрыка „Л. Шапіро". 280 працаваўшых там работнікаў страціла працу.

Лік безработных у Беласточчыне. У беластоцкай прамысловай акрузе зарэгістравана 3830 безработных. З гэтага ліку на валакняны прамысл прыпадае 2266 безработных. (Rplita 160).

Забастоўка ў валакняным прамысьле ў Беластоку. У нядзелю, 2 г. м., на агульным сходзе работнікаў валакнянага прамыслу пастаноўлена абвясьціць забастоўку, дамагаючыся 30 прац. павялічэньня платы. Забастоўка пачалася ў наступным дні і абхапіла фабрыкі валакнянага прамыслу ў Беластоку. Ужо з'арганізаваны забастовачны камітэт. Rplita 163).

Гранічны рух. Газэты пішуць, што на падставе земляробных пропускаў у працягу мінулага тыдня прайшло ў Літву 2800 чалавек і 1700 штук жывога інвэнтара (быдла).

Эпідэмія пажараў у Віленшчыне. Статыстыка падае, што ў месяцы траўні на абшарах Віленшчыны выбухла 127 пажараў. Статыстыка сьцьвярджае, што 70 прац. пажараў паўстала ад неасьцярожнага абходжаньня з агнём.

З Т-ва Бел. Школы.

Павятовы зьезд Т-ва Белар. Школы ў Навагрудку.

Чацьверты зьезд сяброў Т-ва Беларускае Школы Навагрудзкага павету адбыўся 24./V. 1928 г. Прысутных на зьезьдзе з правам рашаюч. гол. было 50 чалавек. Галоўная мэта зьезду—выбары сталай Акружной Управы. Пасьля ўстанаўленьня пытаньняў на парадку дня зьезд заслухаў справаздачу часовай Управы і даклады дэлегатаў ад паасобных Гурткоў аб працы на мяйсцох. Пры вялікай агульнай зацікаўленасьці з боку сяброў культурнаю працаю на вёсцы, ува ўсіх дакладах гучыць тужлівая нотка аб перашкаджаючых асьветнай працы фармальных вымаганьнях з боку Навагрудзкага Старасты, як, напрыклад, вымаганьне, каб кожны старшыня гуртка складаў Старасьце заверанае натарыюсам асьвядчэньне, а то інакш адмаўляецца ў дазволах на спэктаклі. Высьвятліць і адхіліць гэтыя прыкрыя для працы фармальныя перашкоды зьезд даручае новавыбранай Акружной Управе, у склад якой увайшлі: Логаш Мікалай, Пронька Вячаслаў, Валько Ганна, Пратасэвіч Язэп і Данілевіч А., вучыцель Навагрудзкай Белар. Гімназіі.

Даклад аб працы Т-ва на будучыню, які зрабіў прадстаўнік ад Галоўнае Управы грам. Шырма, сустрэў з боку зьезду вельмі прыхільнае спатканьне.

У бягучых справах прынята прапазыка прывітаць зволненых па суду з вастрогу культурных працаўнікоў—Луцкевіча, як старшыню Белар. Навуковага Т-ва, Астроўскага—як б. старшыню Т-ва Белар. Школы і Шнаркевіча, як сэкрэтара, адначасна з гэтым вынесена пажаданьне прыйсьці з дапамогай Навуковаму Т-ву ў Вільні, прыняўшы ўдзел у зьбіраньні ахвяраў на будову „Дому Беларускай Культуры“.

Пасьля зьезду адбыўся спэктакль, ладжаны вучнямі на карысьць Навагрудзкай Беларускай Гімназіі, праграму якога склалі: „Апошняе спатканьне“ — Галубка, вучнёўскі хор і струнны аркестр. Не гледзячы на тое, што п‘есу гулялі маладыя вучнёўскія сілы, уражаньне асталося надзвычай моцнае: былі ў іхняй гульні драматычныя мамэнты такой мастацкай вартасьці і захопленьня, што немагчыма было глядзельніку ўстрымацца ад сьлёз. У кожным выхадзе, у кожным слове чулася у маладых артыстаў глыбокае каханьне да свайго народу, глыбокая вера ў яго нацыянальную сілу і нязломнае імкненьне змагацца за гэты народ і прабіваць разам з ім шляхі да тэй шчасьлівай будучыні, калі „настане ўнукаў панаваньне там, дзе сяньня плача дзед“. На заканчэньне праграмы выступ вучнёўскага хору пад кіраўніцтвам грам. Шумскага. Люба было глядзець на іх, маладых і прыгожых, у сваёй духовай сьветласьці і хацелася пажадаць ім праняcьці праз усё жыцьцё чыстаю і незаплямёнай сваю любоў да сярмяжнага народу, да ўсяго роднага, да ўсяго прыгнечанага і абяздоленага.

Многа недахопаў мае наша Навагрудзкая Беларуская Гімназія, але, навет, пры тых ненармальных варунках, у якіх знаходзяцца Беларусы, іх можна лёгка адхіліць. Толькі рашучае змаганьне з мэтадамі сярэднявечнае схалястыкі можа даць Беларусам эканомію здаровых сілаў для будаўніцтва ўласнага Культурнага Дому.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Вось дык прасьвяціцель.

(В. Якубавічы, Берштаўскае гм., Гарадзенскага павету).

У гэнай вёсцы, Якубавічы, ёсьць паўшэхная Польская школа, кіраўніком і вучыцелем якой зьяўляецца нейкі пан Чаплінскі. Як помняць сяляне якубаўцы, такога вучыцеля яшчэ ніколі ня было. Што-ж гэта за вучэньне, калі дзеці забыліся тое, чаго іх навучылі раней? Цяпер толькі ведаюць ляяцца, ды гвалтаваць каля школы, чакаючы сваго прасьвяціцеля, які ўсьцяж недзе езьдзіць, цягаецца па вёсках да дзяўчат, або часам, зачыніўшыся ў хаце, моцна сьпіць. Часта бываець — пазьбіраюцца вучні, чакаюць,—а вучыцеля няма, тады бягуць дамоў. Ну-ж потым пайдуць пратаколы на бацькоў, і плацяць сяляне па 5 зл. за сваіх дзяцей, а па чыей віне? Фурманак належыць яму толькі 2 на месяц, а ён бярэ іх, сколькі хоча. Солтыс адказваецца даваць, тагды Чаплінскі пускаецца на хітрасьць: Застрашыць якога мужычка пратаколам на вучня, ці скажа, што солтыс яму прыказаў і той рад—ня рад мусіць закладаць жывеліну, і Чаплінскі задаволены паехаў. Цікава, чаму ён штрафаў ня плаціць, што другі раз бадзяецца па цэлай нядзелі і вучні забываюць ня толькі пра вучыцеля, а навет дзе школа! Няўжо-ж так і далей будзе?

Гром.

Як вядзецца культурная праца.

(Слонімшчына).

На Вялікдзень 15. IV. с. г. М.-Галіцкі гурток Т-ва Бел. Школы хацеў паставіць у в. Сасноўцы ў пустым школьным будынку спэктакль, на якім мелі быць згуляны п‘есы „Суд“—Галубка і „Чорт і баба“—Ф. Аляхновіча, дзеля гэтага 7 га таго-ж м-ца была зложана Слонімскаму Старасьце заява аб дазвол, а каб дазвол атрымаць (асабіста) — бо па пошце атрымоўваем па тэрміне — пасылалі 2 раза пасланца да Староства, да якога маем 30 вёрст, аднак, пасланец нічога канкрэтнага ня мог дабіцца, апрача „ідзь, бэндзе пшэслано“. І былі пэўныя, што дазвол атрымаем. Усё прыгатавалі да пастаноўкі. Ажно атрымоўваем паперу ад Старосты, у якой паведамляе... — „залатвёно одмовне“—навет не выясьніўшы, з якіх прычын. Ад 12. IV. с. г. той-жа гурток падаў другую заяву аб дазвол на спэктакль ужо на дзень 22. IV. с. г., на якім мелі быць згуляны „Няскончаная драма“ і „Раскіданае гняздо“. На гэты раз Стараста даў..., але забарону далікатнейшую: зажадаў ад гуртка дазволу ад школьнага інспэктара на школьны будынак і „асьвядчэньне“ адказнае асобы, што бярэ на сябе адказнасьць за належнае адбыцьце спэктаклю, даўшы тэрмін выкананьня да 16. IV. с. г., а пратрымаўшы ў Старостве да 18. IV. с. г. Гэткім чынам, як першы, так і другі спэктакль адбыцца не маглі. Перад гэтым там-жа ставіліся спэктаклі і даваўся дазвол, а сёньня нешта сталася інакшай. Гэткі лёс спаткаў і другія гурткі. Але, каб гэтым толькі кончылася, то хоць крыўдна, але злосьць устрымаць можна. Але вось другі выпадак: на 29. IV. 28 г. Гладыскі гурток Т-ва Бел. Шк. Касаўскага павету, атрымаў дазвол на пастаноўку спэктаклю ў в. Гладышах з агаворкаю—„калі паліцыя прызнае памешканьне за адпаведнае“... Доўга артысты і глядзельнікі чакалі паліцыянтаў, а яшчэ даўжэй прышлося прасіць іх аб дазвол, якія прызналі памешканьне не адпаведным, бо нібы ўстава вымагае двое дзьвярэй і воду з бочкамі, гэта значыць на выпадак пажару, каб людзі не пагарэлі. Відаць, добра яны нас шкадуюць! А на другі раз паны заявілі, што ў жадным выпадку ставіць „не вольно“. А выбіралі дом найлепшы з ўсяе вёскі: высокі, чарапіцамі крыты, а тут маеш—не надаецца. Дык найдзі-ж дзе на вёсцы дом, які меў-бы 2-е дзьвярэй, калі яшчэ мала хто з зямлянкі вылез. Тое, што робіцца на вёсцы, падаю толькі часткова, бо трэба памятаць, што цэнзар ёсьць, а то глядзі, што ўся праца на вецяр пайдзе.

Дык вось, пры якіх абставінах прыходзіцца весьці культурна-асьветную працу на вёсцы!

Сусед.

Усюды будзяцца, а ў нас яшчэ сьпяць!

(Вёска Рачканы, Ляхавіцкае гміны, Баранавіцкага павету).

У кожным нумары нашай газэты „Голас Працы“ знаходзяцца карэспандэнцыі з вёсак, у якіх пішацца, што нашая цёмная вёска прабуждаецца са сну. Яна пазнала, што так надалей нельга жыць, і, каб палепшыць дабрабыт ў вёсцы, трэба працаваць, і то працаваць не абы як! Ува-ўсіх кутках нашай Бацькаўшчыны прабуджаюцца яе сыны і ідуць супольным фронтам процi цемры, каб зьнішчыць гэтага ворага нашай вёскі, каб падняць яе дабрабыт, — а ў нашай вёсцы зусім рэзкія працілежнасьці. Такія-ж самыя сыны свайго краю і так-жа сама павінны працаваць, але яны сабе сьпяць і, як гаворыцца, „у вус ня дуюць“. І калі яны абудзяцца, то проста ня можна прадбачыць.

Праўда, больш сьвядомыя сяляне выступалі процi ўсяго гэтага, але надарма! Бо што значыць жытні каласок пасярод дзікай травы? Нічога! Усёроўна заглохне, бо не даюць яму разрасьціся.

Цэлую нашу вёску можна надзяліць на сялян, трохі сьвядомых, каторыя думаюць так: „Ай, якая б то ня была ўлада, усёроўна з сялян будуць зьдзекавацца“. А як пачнеш яму тлумачыць, што ўсё роднае ляпей, дык рукой махнё.

Вялікая цемната!!!

Другая частка людзей нашай вёскі — гэта тыя, каторыя зусім нічога не разумеюць і для іх — гэтай частцы, толькі патрэбны кіраўнік, то ўсё-б пайшло іначай.

А як яны могуць каго вучыць, калі яшчэ іх трэ‘ вучыць!

Дзеля гэтага дзеці іх гадуюцца зусім без выхаваньня. Як ідуць вуліцай, хлапцы як адзін, — па гадоў 18—19, як дубы, а гледзячы на іх, падумаеш: „Вось каб іх з‘арганізаваў, ды разам стаўляў спэктаклі і г. д.—вялікая-б была помач працоўным! А то бяз працы бадзяюцца, п‘юць.

Ну, дык ці не пара Вам, браткі, прабудзіцца? Ці не пара ўзяцца за працу для дабра працоўнага народу! Пратрэце вочы, бо ўжо сонца змаганьня ўсходзіць над нашым родным краем і сваімі праменьнямі многіх прабудзіла ад сну!

Хутчэй, браты, да працы!

Ворaг цемры.

Хутчэй выпруць, ніж папруць!

(В. Шэні, Пружаншчына).

Пружанскі павятовы соймік дня 12.III 28 г. залажыў у Пружане касу „Popieranie rolnictwa“. Кіраўніком касы зьяўляецца абшарнік Чарноцкі, а сябрамі ўсе пружанскія жыды-капіталісты. Не адзін з чытачоў падумае: „Добрыя паны ў Пружанском сойміку, памагаюць сялянам“! Але ўсюды, браточкі, яны нам памагаюць так, як кашаль хваробе, гэтак сама і гэтаю касаю. Да прыкладу возьмем наступнае: У селяніна в. Шэні Арцёма Манькі здох конь, вось ён і думаў скарыстаць з гэнае дагоднае пазычкі (ад сумы у год адлічваюць 12%). Зложыў па ўсіх правілах дэклярацыю і чакаў, як сонца з-за хмары, пазычкі каб купіць каня і „паперці вяоною галадоўку“, якая, як ведама, і апіраецца на каня. Мінула месяц часу, а пазычка, як у воду танула, а як Арцём даведаўся, то і не атрымаць яе яму. Чаму? А таму, што дэкляраць пашла на цэнтрафугу, па ўсіх установах, а як зашла на пастарунак, то з пастарунку напісалі, што сын Арцёма „камуніст“ „wywrotowiec“, а далей пра пазычку няма гутаркі. Дык вось як, грамадзяне! Паны хутчэй нас патрапяць выперці, ніж паперці.

Агонь.

Праца казённага „культуртрэгера“.

(Баранавіцкі пав., Ястрабская гм.).

Ня мінула „божая ласка“ нашую гміну, бо яна атрымала сэкрэтара по назначенію свыше, ад самага пана баранавіцкага Старасты. Сяляне яго, хоць і ня хочуць, але заўсёды змушаны з крыўдаю на душы пазіраць на польскага асадніка-галілеюша. Гэты панок атрымаў добры кавалак зямлі, але сам на ёй не працуець (як і кожны іншы асаднік на нашых землях), сам сядзіць у гміне і вядзе „культурную“ працу. Зажадалася нашаму галілеюшу „падняць беларускую вёску на высокую ступень культурнага жыцьця“. Для гэтай мэты заснаваў пры гміне нейкую „Касу Стэфчыка“. Што-ж, рэч добрая, часамі сяляне можа атрымаюць невялічкую пазычку ў наглых жыцьцёвых выпадках. І вось, „культуртрэгер“—асаднік у гэтай касе зрабіўся сэкрэтаром, а селяніна Фурсу з вёскі Малахоўцаў абабраў на скарбніка. І што-ж вы, браточкі, скажаце — зусім плянова і разумна ўпарадкаваў начальства (адразу было відаць, што спэцыяліста).

Залатвіўшы справы з прызыдыумам і закладзінамі касы, сабраў кумпанію сваіх прыхлебнікаў і ў Баранавіцкім Сойміку ўзялі на рахунак касы аўса. Асаднік Банаховіч 12 пуд. з паловай, „разжалаваны“ войт (рэч вядомая, за добрыя „машаніцкія“ справы), Мароз з в. Млынка—7 пуд. з паловаю і памочнік сэкрэтара (сельсаюзьнік) шчыры прыхільнік Рагулі в Ярэмічам (у часе выбараў агітаваў за васемнастку, дык Староста Баранавіцкі за гэта быў звольніў яго, але, калі асаднік Банаховіч растлумачыў Старасьце, што сельсаюзьнік В. Астаповіч чалавек можа быць і нашым і вашым — дык Стараста прыняў яго нанова): гэты панок узяў 12 пуд. з паловай. Гэтую пазычку галелеюш Банаховіч „забыўся“ запісаць у выходныя кнігі касовыя, бо ў прых. запісаў. Дзеля таго, што самаму авёс ня быў патрэбны, дык даў „пазычку“ ад сябе нейкаму абшарніку Рамашэўскаму, за што апошні падарыў Банаховічу двух індыкоў.

Банаховіч і К-° цешыліся з пазычкі і бралі працэнты на гарэлку ад Рамашэўскага. Аднак, доўгая пацеха не цягнулася, прыехаў з Вільні кантроль „Касы Стэфчыка“ і зажадаў справаздачы. Перагледзіў кнігі сэкрэтара і, падлічыўшы грошы ў скарбніка Фурсы — дагледзіў недахоп блізка каля 700 злотых. Уся віна звалілася на плечы селяніна Фурсы. У часе рэвізіі абшарнік Рамашэўскі прывёз заплаціць працэнты за авёс і праз памылку даў грошы скарбніку Фурсе. Тады-та выкрылась агідная работа асадніка і сельсаюзьніка В. Астаповіча. Брава! пан Астаповіч, тактыка ваша якраз, як Ярэміча! здольны толькі праліваць кракадылявы сьлёзы над доляй беларускага селяніна, а асаднік Банаховіч паказаў мэтады заходняй культуры (адным словам дапяў тых мэтаў, дзеля якіх яго пасадзілі на нашу зямлю).

З жыцьця Беласточчыны.

Папулярная на беластоцкім груньце драматычная сэкцыя Т. Б. Школы, захопліваючая сваёй гульнёй работніцкія масы, не абмежавалася працаю ў Беластоку і пашырыла сваю карысную дзеяльнасьць на правінцыю. У месяцы траўні ў розных кутках нашага павету былі наладжаны ёю 3 спэктаклі, першы з якіх адбыўся 6. V. 28 г. ў мяст. Хорашчы. Згулялі „Выбары Старшыні“ трагі-камэдыю ў 3 дзеях Я. Быліны. Мастацкая гульня, зьмест п‘есы, узяты жыўцом—з жыцьця беларускае вёскі, пакінулі ў глядзельнікаў вялікае ўражаньне. Гучныя воплескі захопленай публікі былі слушнай нагародай сябрам драм. сэкцыі, перамогшым процьму перашкодаў з боку ворагаў беларускае культуры, жыруючых адвеку на цемры нашага многапакутнага народу.

Наступны спэктакль адбыўся ў памешканьні Народнага Дому вёскі Баршчэва. Згулялі „Суд“ — Галубка п‘есу ў 1 дзеі і „Мікітаў Лапаць“ М. Кудзелькі — камэдыю ў 2 дзеях.

Працоўных братоў, рупіўшыхся аб пашырэньні асьветы на вёсцы акалічнае сялянства закідала краскамі. Выступленьне хору сэкцыі павялічыла энтузыязм прысутных да роднага беларускага слова.

Трэці па ліку ў гэтым месяцы спэктакль адбыўся 21 траўня ў вёсцы Агароднікі. Паўтарылі праграму папярэдняга спэктаклю. Чысты даход апошняга спэктаклю — 40 зл. пойдзе на закладзіны бібліятэкі ў вёсцы Агароднічкі. Астаецца пажадаць працавітай сэкцыі і яе энэргічнаму кіраўніку, гр. Андрэйчыку, пасьпеху ў іх далейшай працы.

К. С.

Паштовая скрынка.

Мазалю. Карэспандэнцыю без праўдзівага прозьвішча і адрасу зьмясьціць ня можам. — **Голцы.** Вы ў сваёй карэспандэнцыі не напісалі аб тым, якую п‘есу ставілі на Вялікдзень. Каб гэта было зазначана, то па меры магчымасьці скарысталі-б.—**Нявольніку з в. Гезгалы.** Вы пішаце ў сваёй карэспандэнцыі, што ў вашай вёсцы вельмі дрэнны поп, які займаецца рознымі ашуканствамі, абы толькі з беднага селяніна выкруціць апошні грош. Гэта вельмі добра, што Вы крытыкуеце прапаведнікаў „добра“, але нажаль наша газэта ня можа зьмясьціць Вашай карэспандэнцыі, бо ёсьць аб чым лепшым пісаць. Аб тым-жа, што папы ўжываюць розныя махінацыі для адурманіваньня працоўных гушчаў, сялянам і работнікам даўно ўжо ведама.

Грамадзяне! Памажэце пагарэльцам!

Вёска Скіпоравічы, Казлоўскае воласьці перад сьвятамі, а вёска Акунінава, Дзявяткаўскае воласьці ўжо пасьля сьвят зьнішчаны пажарам. Пажары былі такія страшныя, што навет ёсьць і людзкія ахвяры.

Дык грамадзяне! памажэце сваім няшчасным братам! Ня дайце іх дзеткам распаўзьціся з торбамі па сьвету! Складайце ахвяры, хто чым можа, і адвозьце пацярпеўшым. Гурткі Т-ва павінны ў найбліжэйшым часе паставіць па аднаму спэктаклю на карысьць пагарэльцаў, даход ад якога можна пераслаць і праз Акружную Управу.

Слонімская Акружная Управа.
Слонім, Ражанская 55.

Ад дырэкцыі Віленскае Беларускае Гімназіі.

Аб умовах прыйма вучняў на новы 1928/29 школьны год.

Згодна з распараджэньнем Куратара Віленскага Школьнага Вокругу ад 10 гэтага траўня, уступныя экзамены ў I, II, III, IV, V, VI, і VII кл. адбываюцца **выключна вясною.** Для паступленьня ў Віленскую Беларускую Гімназію вызначаны тэрмін экзамену; 21, 22 і 23 чэрвеня ўва ўсе клясы (II-VII), 27-28 чэрвеня ў I клясу. У восені да ўступных экзаменаў вучні дапускаюцца толькі з дазволу Куратарыума, па прадстаўленьню Дырэкцыі Гімназіі. На будучы школьны год вакансіі маюцца ўва ўсіх клясах. Прыймаюцца хлопцы і дзяўчыны.

Узрост: У першую клясу ад $9^{1}/_{2}$ да 12 гадоў, у 2-ю клясу ад $10^{1}/_{2}$ да 13 гадоў, у 3-ю клясу ад $11^{1}/_{2}$ да 14 гадоў, у 4-ю клясу ад $12^{1}/_{2}$ да 15 гадоў і т. д., лічучы па дзень 1-га ліпня 1928 года.

Дакуманты: 1) Заява аб прыйме, 2) мэтрыка, 3) пасьведчаньне доктара аб паўторным прышчэпе воспы і 4) пасьведчаньне аб папярэдняй адукацыі. Заявы і дакуманты трэба прысылаць загадзя да экзаменаў не пазьней 10-га чэрвеня, у першую клясу—25-га чэрвеня.

Праграмы можна выпісваць па пошце з канцэлярыі Гімназіі (Вільня, Вострабрамская вуліца дом № 9), далучаючы на перасылку паштовую марку ў 25 грошай.

Як паказалі мінулыя гады, некаторыя вучні зьяўляюцца на экзамен, ня ведаючы добра праграмы прадметаў, з якіх трэба трымаць экзамены. Дзеля гэтага зварочваецца ўвага, што паступаючыя ў якую-колечы клясу з польскіх пачаткавых ці сярэдніх школаў павінны абавязкава трымаць экзамен па адпаведным праграмам **з беларускае мовы** (чытаньне, пісаньне, граматыка, вершы, тэорыя і гісторыя літэратуры) **і гісторыі Беларусі** за курс II і III клясы.

Паступаючым з хатняю падгатоўкаю прапануецца адносна праграмаў і падручнікаў зварочвацца ў канцэлярыю Гімназіі для падрабязнага вытлумачэньня, па якому курсу і з якіх прадметаў трэба трымаць экзамены.

Падручнікі можна выпісваць: Беларуская Кнігарня Беларускага Выд. Т-ва (Вільня, Вострабрамская № 1, у Навагрудку, Вялейцы і Слоніме).

Плата за навуку мае быць устаноўлена Куратарыумам. Аб гэтым будзе своечасна абвешчана.

У інтэрнаце (толькі для хлапцоў) прадбачыцца ад 20 да 30 вакансіяў выключна для вучняў малодшых клясаў, з платаю за ўтрыманьне ад 50 да 60 зл. у месяц.

Дырэктар: **С. Паўловіч.**

Рэдактар-Выдавец: Ал. Рудзінскі.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.